Запека К.Г., студ. гр. 404 ФК і СКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Варановіч І.М.,
кандыдат культуралогіі

# ТВОРЧАСЦЬ У.МУЛЯВІНА І АНСАМБЛЯ “ПЕСНЯРЫ” ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МУЗЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ БЕЛАРУСІ

Афіцыйнай датай заснавання калектыву лічыцца 1 верасня 1969 г., калі была ансамблю нададзена новая назва – “Песняры”, да гэтага былі “Лявоны”, яшчэ раней – “Арбіта - 67”. Творчае крэда было закладзена ў самой назве, асновай рэпертуара была беларуская народная песня і яе прапаганда з’яўлялася галоўнай задачай.

Першым беларускім класікам, з творчасцю якога пачаў знаеміцца У.Мулявін, стаў Я.Купала. Дарэчы, яго паэзія заўседы была для Мулявіна стрыжневай, да яе ен звяртаўся не раз і ў розныя гады. Так, фолк-рок-опера “Песня пра долю” была напісана паводле паэмы Я.Купалы “Адвечная песня” і выйшла ў свет у 1976 годзе. Гэта быў свайго роду ўнікальны праект, які ўяўляў сабой адзіную праграму ў гісторыя ансамбля, калі ў складзе спявала жанчына (партыю Жонкі выконвала Л.Ісупава). Акрамя таго, ні да гэтай праграмы, ні пасля яе артысты на сцэне не таньчылі, а ў оперы была цэлая харэаграфічная пастаноўка.

Да творчасці Я.Купалы ў Мулявіна былі асаблівыя адносіны. Не толькі таму, што Купала быў любімым паэтам, у творах якога Уладзімір Георгіевіч знаходзіў адказы на многія пытанні, але і таму, што творы Купалы даволі гарманічна перакладаліся на музыку, паэзія пісьменніка вельмі музыкальна.

У 1988 годзе адбылася прэм’ера вакальна-інструментальнай праграмы песень і рамансаў на вершы Я.Купалы. Да гэтага, у 1982 годзе, была створана песенна-інструментальная праграма “Я не паэта”, прымеркаваная да 100-годдзя з Дня нараджэння пісьменніка. І наканец, у 1978 годзе, выйшла ў свет вакальна-сімфанічная рок-араторыя “Гусляр” [1, с. 50].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спачатку І.Лучанком была напісана кантата “Курган” па аднайменнай паэме Я.Купалы – гэта была дыпломная работа кампазітара. Потым У.Мулявіным была зроблена аранжыроўка іновы твор увайшоў у праграму “Песняроў” пад назвай “Гусляр”. Так кантата “Курган” ператварылася ў вакальна-сімфанчную рок-араторыю “Гусляр”. Рок-араторыя складаецца з 12 частак (столькі іх і ў паэме Купалы). Увогуле, у “Гусляры” амаль адсутнічае адыход ад тэксту арыгінала.

Галоўная роль у гэтым творы належыць хору, які распавядае аб тым, што адбываецца, і аркестру, якому адведзена вельмі важная сюжэтаствараючая і вобразная роль. У “Гусляры” толькі дзве сольныя вакальныя партыі, з якіх толькі адна з’яўляецца закончаным нумарам. Ролю Князя на сцэне выконваў У.Місевіч, а ў запісу яна гучыць у выкананні А.Кашэпарава. У ролі Гусляра выступаў сам Мулявін.

Але і рок-операй у поўнай меры “Гусляра” назваць таксама немагчыма – у ім выкарыстоўваюцца музычныя сродкі і прыемы арт-рока, джаз-рока, класічнай і сучаснай акадэмічнай музыкі. Па характару музычных вобразаў “Гусляр” з’яўляецца тыпічным творам еўрапейскага сімфанізма, з супрацьпастаўленнем Дабра і Зла ў вобразах Гусляра і Князя, народа і княжацкай чэлядзі. Кампазітар актыўна выкарыстоўваў такі класічны оперна-сімфанічны сродак развіцця музычнага сюжэту як лейтматыўная сістэма. Некалькі розных лейтматываў мае Зло, некалькі – Дабро. Тэмы Дабра – лірычныя, распеўныя, тэмы Зла – рэзкія, вуглаватыя, жорсткія. Пад час працы над “Гусляром” музыканты свядома перайшлі ад эстраднага тыпу мышлення да сугуба класічнага.

Па ліцэнзіі студыі гуказапісу “Мелодыя” кампакт-дыск “Гусляр” выйшаў на Захадзе праз дваццаць год пасля прэм’еры ў Савецкім Саюзе. І меў вялікі поспех у слухачоў. “Гусляр” быў аднесены да 20-ці лепшых альбомаў такога накірунку як прагрэсіў-рок. Добрыя водгукі былі і ў СМІ. А вось айчынная публіка працу недаацаніла. І гэта сведчыць толькі аб тым, што праграма апярэдзіла свой час і была разлічана на больш падрыхтаваную аўдыторыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для радавых прыхільнікаў творчасці “Песняроў” гэты твор быў цяжкаваты для ўспрымання, а “кансерваторская” публіка не была падрыхтавана да таго, што выкананні ВІА може прагучаць складанае сімфанічнае сачыненне [2, с. 396].

Звяртанне да беларускай народнай песні і яе інтэрпрытацыя ў стыле рок-музыкі было для Беларусі занадта смелым. Увогуле, падобнае ў тыя часы лічылася амаль што варварствам. Бесперспектыўнасць выкарыстання беларускай народнай песні была, па меркаваннях тагачасных айчынных мэтраў, у яе інтанацыйна беднай, невыразнай і вялай мелодыі. У кулуарах “Песнярам” прарочылі кароткае жыцце. Пра народную песню Мулявін гаварыў, што гэта з’ява дзіўная, хаця і вельмі, вельмі складаная.

Да тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў Мулявіна былі асаблівыя адносіны. У 1984 годзе “Песняры” стварылі спецыяльную праграму да 40-годдзя вызвалення Беларусі, былі напісаны песні на вершы паэтаў-франтавікоў. Называлася яна “Праз ўсю вайну”. Гэта была нават не праграма, а цэлы музычны спектакль з 17-ці самастойных нумароў. Прэм’ера адбылася ў вялікай зале філармоніі. Таксама у рамках гэтай праграмы адбыўся так званы самы маўклівы канцэрт “Песняроў”, калі на плошчы перад Тэатрам оперы і балета было больш за 100 тыс. (!) гледачоў. Было цесна так, што людзі не маглі нават варухнуцца [2, с. 190].

Першы “Залаты дыск” у Савецкім Саюзе, шматмільенныя тыражы праданых пласцінак, перамогі на міжнародных конкурсах і выступленні на фетывалях у Канах, Сопаце, “Залаты леў” у Лейпцыгу, “Varadero” на Кубе, “Залаты Арфей” у Балгарыі, Хельсінкі, гастролі на ўсіх кантынентах свету (за выключэннем Антарктыды і Аўстраліі), пакарэнне 13 штатаў Амерыкі (у 1976 годзе) – гэта рытм жыцця Уладзіміра Мулявіна.

У 32 гады – першае ганаровае званне “Заслужаны артыст БССР”, праз 5 гадоў – “Народны артыст БССР”, у 1980 годзе – “Заслужаны дзеяч мастацтваў Польшчы” і – гістарычнае званне “Народны артыст СССР” у 1991

годзе было прысвоена ўпершыню адзінаму кіраўніку вакальна-інструментальнага ансамбля.

Вышэйшыя дзяржаўныя ўзнагароды Беларусі – медаль і ордэн Ф.Скарыны, ордэн "Крылага льва I ступені" за выдатныя заслугі ў справе Адраджэння Айчыны (прысвоены Міжнароднай федэрацыяй па правах чалавека пры ААН і ЮНЕСКА) і адкрыцце на Алее Зорак у Маскве асабістай пліты 21 студзеня 2001 года – гэта ўсе міжнароднае прызнанне Песняра.

Праз яго песню многім людзям адкрылася непрыкметная прыгажосць першазданных куткоў Беларусі. Яго дзіўны голас мімаволі застаўляў закахацца ў наш край нават тых, хто тут ніколі не бываў, застаўляў заміраць і пранзаў наскрозь душу, як пранзае жар ці холад. Яму верылі заўседы і вераць зараз, пра што б ен ні спяваў: пра каханне, глыбокае і шчырае, ці калі выконваў драматычны маналог пра вайну, пра Беларусь.

Падагульняючы можна адзнасыць, што ўклад У.Мулявіна і створанага ім калектыву "Песняры" ў беларускае нацыянальнае музычнае мастацтва бясспрэчны. Дзякуючы творчасці вышэйадзначанага калектыву ў нашай краіне з'явіўся такі музычны накірунак як фольк-рок; адным з найбольш каштоўных дасягненняў можна лічыць той факт, што беларуская народная песня стала запатрабаванай і папулярнай сярод моладзі як Беларусі, так і іншых краін былога Савецкага Саюза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Антановіч, В. Дыназаўры яшчэ не вымерлі: гутарка з Народным артыстам БССР Уладзімірам Мулявіным з нагоды нечаканага юбілею Дзяржаўнага ансамбля "Песняры"// Мастацтва Беларусі. – 1989. - № 9. – С. 50.

2. Крушынская, Л.А. Уладзімір Мулявін. Нота лесу: успаміны, інтэрв'ю, даследванні/Л.А. Крушынская. – Мн.; Мастацкая літаратура,2004. – 446с.

3. Падбязскі, Дз. У. Слухаючы Уладзіміра Мулявіна// Літаратура і мастацтва. – 1991. – 11 снежня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ